Андруковіч Г.А., студ. гр. 202а
ФКіСКД
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік –Клімаў І.П.,
канд. філал. навук

# СУЧАСНАЯ ПРАБЛЕМАТЫКА РЭКАНСТРУКЦЫІ ВІЛЕНСКАГА БЕЛАРУСКАГА МУЗЕЯ ІМЯ ІВАНА ЛУЦКЕВІЧА

**1.1 Гісторыя праблемы.** Гісторыя музея пачыналася: "...з прыватнае калекцыі былога менскага гімназіста Івана Луцкевіча. За свае нядоўгія 38 гадоў жыцця гэты выбітны асветнік сабраў вельмі багатую калекцыю і перад смерцю завяшчаў яе Беларускаму навуковаму таварыству ў Вільні. Напачатку, з-за адсутнасці фінасавых сродкаў, гэты збор не быў належным чынам сістэматызаваны і ўпарадкаваны. Толькі ў 1921 г. музей імя І. Луцкевіча набыў памяшканні, калі з прыватнае кватэры быў перавезены ў былы Віленскі базыліянскі кляштар. З гэтага часу пачынаецца адлік гісторыі музею як арганізаванай навукова-мастацкай установы. З пачатку 1920-х гадоў колькасць мастацкіх экспанатаў, разнастайных дакументаў і фотаматэрыялаў значна павялічылася. У гэты час былі сфармаваны тэматычныя і адмысловыя аддзелы: дагістарычны, этнаграфічны, побытавы, рукапісаў і друкаў. Чыннасцю музею кіравала рада, якая працавала на правах секцыі Беларускага навуковага таварыства. З канца 1920-х гадоў яе складалі тры сябры: Антон Луцкевіч (дырэктар), Уладзімір Самойла (бібліятэкар) і казначэй Антон Неканда-Трэпка. У 1933 г. А. Луцкевіч падрыхтаваў і выдаў павадыр па музеі" [1].

Музей праіснаваў да сярэдзіны 20 ст., перажыўшы другую сусветную вайну, далей жа: "19 лістапада 1944 г. у Беларускі музей з'явілася ўрадавая дэлегацыя БССР з прапановай пераехаць у Менск. Дзеля канчатковага вырашэння гэтага пытання Я. Шутовіч прапанаваў 21 лістапада правесці нараду з удзелам прадстаўнікоў беларускай грамадскасці. Але 20 лістапада Янка Шутовіч быў арыштаваны (у Вільні ён з'явіцца толькі праз 12 гадоў)..." [1]. Амаль адразу пасля арышту дырэктара Беларускага музея бальшавікамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

было вырашана: “Усе экспанаты падзяліць на групы: 1) экспанаты, што маюць дачыненне да гісторыі літоўскага народу; 2) экспанаты, што маюць дачыненне да гісторыі беларускага народу; 3) экспанаты, што маюць дачыненне да гісторыі і літоўскага, і беларускага народаў; 4) экспанаты, што не маюць дачынення да гісторыі і беларускага, і літоўскага народаў. Экспанаты першай і чацвёртай групаў — пасля адбору — пакінуць у Літве. Падрыхтаваць да вывазу, калі такія ёсць, толькі іх дублікаты. Экспанаты другой групы падрыхтаваць да вывазу, пакінуць у Літве іх дублікаты пры ўмове іх наяўнасці” [1].

**1.2. Сучасны стан праблемы Беларускага віленскага музея.** Першы аспект праблемы Беларускага віленскага музея можна апісаць наступным чынам: гэта ўстанова, якая пазыцыянавала сябе як беларуская нацыянальная, і таму перспектывы яе аднаўлення ва ўмовах сённяшняй нацыянальнай літоўскай дзяржавы вельмі і вельмі слабыя.

Другі аспект праблемы – музейныя фонды, падзеленыя зараз паміж дзвюма дзяржавамі, пры амаль гарантаванай немагчымасці іх рэстытуцыі. Праблема ўскладняецца тым, што музейныя фонды і Рэспублікі Беларусь, і Літоўскай рэспублікі вельмі небагатыя, а таму не магчыма спадзявацца, што адзін з бакоў ахвяруе сваімі і без таго беднымі калекцыямі дзеля цмянай перспектывы ўз’яднання гэтай гістарычнай установы.

Трэці аспект праблемы палягае ў тэрытарыяльнай прыналежнасці экспанатаў, з якіх вялікая частка датычыць Віленскага краю, хоць і беларускага ў этнаграфічным плане, але ўсё-ткі Віленскага, які тэрытарыяльна ўваходзіць у склад Літоўскай рэспублікі. Разам з тым шмат якія экспанаты музея ўвогуле не ідэнтыфікаваныя – ні тэрытарыяльна, ні этнаграфічна, ці якім-небудзь чынам [2].

У выніку атрымліваецца раздзеленая па розных краінах музейная калекцыя, што належыць раскіданай па розных краінах установе, якая да таго ж не ўспрымаецца як правамоцная адным з бакоў (Беларускі віленскі музей быў утвораны пасля першай сусветнай вайны пры польскай уладзе, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літоўскім бокам успрымаецца як акупацыйная). Калекцыя раздзеленая не толькі паміж краінамі, але і паміж рознымі ўстановамі ўнутры саміх краін, што яшчэ больш ускладняе праблему аднаўлення музея.

**2.1 Музеялагічны падыход.** Дадзены падыход мусіць даць адказ на здавалася б зусім простае пытанне: "Якім павінны быць музей, зыходзячы з сучаснага стану ягоных калекцыяў?"

Падсумоўваючы сказанае ў пп. 1.1. і 1.2., можна прапанаваць, каб музейныя фонды адноўленага Беларускага віленскага музея ў любым разе часткова ці нават цалкам былі б сфармаваныя на базе копіяў аўтэнтычных экспанатаў. З гэтага гледзішча найбольш натуральным бачыцца стварэнне Віртуальнага Беларускага віленскага музея, што дазваляе вырашыць цэлы шэраг задачаў, з якіх найскладаная – немагчымасць вярнуць аўтэнтычныя экспанаты. Віртуальны музей будзе змяшчаць лічбавыя копіі і рэканструкцыі аўтэнтычных экспанатаў з раз'яднаных музейных калекцый, а таксама ўключаць іх у шырокі навуковы зварот, што выгадна і Рэспубліцы Беларусь, і Літоўскай рэспубліцы.

Формы віртуальнага музея могуць быць абсалютна розныя, што наўпрост залежыць ад спецыфікі музейных калекцый, традыцый дадзенай музейнай установы, тэхнічных сродкаў і магчымасцяў [3].

**2.2 Тэхнічныя сродкі і спецыфіка рэканструкцыі музея.** Пры стварэнні віртуальнага музея непазбежна ўзнікаюць наступныя праблемы:

- выяўлення музейных памяшканняў;
- выяўлення <u>розных</u> музейных экспанатаў;
- музейнай палітыкі (сюды адносіцца форма і змест атрыбуцыі экспанатаў, мовы музейных экскурсій і інш., наяўнасць або адсутнасць сродкаў немузейнай інтэрпрэтацыі, склад экспазіцыйнага матэрыялу).

Пры аднаўленні Беларускага віленскага музея прапануецца пры выяўленні экспазіцыйных памяшканняў віртуалізаваць іх падобна да памяшканняў Базыльянскага кляштара ў Вільні, дзе Беларускі музей

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

размясціўся ад пачатку. Такая прапанова тлумачыцца найперш пэўнай традыцыяй і гістарычнай пераемнасцю Беларускага музея ад ранейшага за яго таварыства Філаматаў, якія былі часткова зняволеныя ў базыльянскіх мурах (у дадатак, гэта робіць саму аўру памяшканняў Базыльянскага кляштара яшчэ аднім музейным экспанатам, што, пэўна, ўлічвалася і тагачаснымі музейнымі супрацоўнікамі пры правядзенні экскурсій). Разам з тым, пераймаючы знешні выгляд будаўнічых структураў памяшканняў корпусу Базыльянскага кляштара, прапануецца не паўтараць саму планіроўку дасканала, але пры захаванні знешняга выгляду канструкцыяў "рассунуць" памяшканні – гэта тлумачыцца патрэбай экспанаваць усе экспанаты, тады, як пры самім існаванні музея гэта было немагчыма з прычыны недахопу экспазіцыйных плошчаў.

Пры віртуалізацыі экспанатаў прапануецца наступнае рашэнне:

- экспанаты выяўленчага характару (карціны, замалёўкі, дрэварыты, адбіткі пячатак, фотаздымкі, кнігі і да т.п.) віртуалізаваць праз стварэнне віртуальнай мадэлі карціны з праекцыяй выявы экспаната;
- экспанаты аб'ёмныя віртуалізаваць падвойна: з аднаго боку праз стварэнне віртуальнай 3-мернай копіі экспаната, з іншага – праз рэпрэзентацыю 2-мерных фотаздымкаў з арыгінала.
- экспанаты тэкставага характару могуць быць рэпрэзентаваныя праз тэкставы файл з ілюстратыўным матэрыялам.
- экспанаты, якія былі страчаныя альбо яшчэ не выяўленыя, дазваляецца рэпрэзентаваць праз віртуалізацыю аналагаў.

**3. Вынік.** Віртуальны Беларускі віленскі музей імя Івана Луцкевіча павінны стаць не проста зборам лічбавых копій колішняга музея, гэты музей павінны стаць музейна-адукацыйным рэсурсам. Ён будзе здольны не толькі рэпрэзентаваць музейныя калекцыі, што належылі неіснуючай ужо ўстанове, але праз сучасныя сродкі віртуалізацыі паспрабаваць перадаць атмасферу беларускага культурніцкага жыцця Вільні 1-й паловы 20 ст. Зыходзячы з гэтых мэтаў, плануецца не абмяжоўвацца толькі музейнымі зборамі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

памяшканнямі, але рэпрэзентаваць, да прыкладу, віртуальную вандроўку па Вільні 1930-х гадоў (у фармаце відэастужкі), а таксама праз падобныя віртуальныя сродкі і рэсурсы.

Літаратура:

1. Запартыка, Г. Аб перспектывах навуковай рэканструкцыі музею імя Івана Луцкевіча ў Вільні / Г. Запартыка // Спадчына. – 2003. – № 4-5.

2. Інвэнтарная кніга Музэю ім. Ів. Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні // Спадчына. – 1995. – № 1-5.

Рошчына, Т. Перамешчаныя культурныя каштоўнасці. Лекцыя 1. Рэстытуцыя культурных каштоўнасцяў (юрыдычныя, маральныя і навуковыя аспекты) / Беларускі калегіюм: Найноўшая гісторыя // http://baj.by/belkalehium/lekcyji/historyja/roszczyna_01.htm

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ